Урок сёння і заўтра

Вольга ЧУМІЧОВА

# "ЛІЛЕЮ МЛЯВЫ ПЛЁС ЛЮЛЯЕ..."

## ЭСТЭТЫЧНАЯ ФУНКЦЫЯ МОВЫ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ. XI КЛАС

**Тэма:** эстэтычная функцыя мовы мастацкай літаратуры.

**Мэта:** замацаванне ведаў па тэме "Стыль мастацкай літаратуры"; удасканальванне ўменняў і навыкаў стылістычнага аналізу мастацкіх тэкстаў і вызначэння сродкаў рэалізацыі эстэтычнай функцыі мовы мастацкай літаратуры; развіццё творчага мыслення; выхаванне культуры працы ў малой групе, цікавасці да мастацкага слова.

**Абсталяванне:** карткі з творчымі заданнямі для груп, слоўнікі.

**Міжпрадметныя сувязі:** беларуская літаратура.

ХОД УРОКА

На ўроку праца арганізоўваецца па групах. Пажадана, каб было 3 – 4 групы па 4 – 6 чалавек. Загадзя парты расстаўляюцца так, каб удзельнікі групы бачылі адно аднаго і каб зручна было слухаць іншыя групы. На асобнай парце – слоўнікі беларускай мовы.

I. Настаўнік адзначае, што гэты ўрок незвычайны. Вучні павінны ўявіць сябе творцамі мастацкага слова, зрабіць высновы пра асаблівасці мовы літаратуры ў адрозненне ад мовы навукі, паразважаць, дзеля чаго і як ствараюць пісьменнікі прыгожыя непаўторныя вобразы і малюнкі жыцця. Гучаць радкі з верша Рыгора Барадуліна:

*Лілею млявы плёс люляе,*
*З-пад злежалых аблок здалёк*
*Ляціць віхлясты і бялявы*
*Пялёстак лёгкі – матылёк.*

• Якія мастацкія сродак выкарыстаны ў гэтым вершы? (Алітэрацыя.) Дзеля чаго, на вашу думку? Чаму аўтар не канстатуе проста: ляціць матылёк? (Дзеля прыгажосці.) Такім чынам настаўнік разам з вучнямі фармулюе тэму ўрока: эстэтычная функцыя мовы мастацкай літаратуры.

• Паслухайце азначэнні слова *рука* (пажадана, каб карткі з азначэннямі і заданнямі для груп захоўваліся асобна ў розных каляровых канвертах).

*Рука* – верхняя канечнасць чалавека ад пляча да кончыкаў пальцаў, а таксама ад запясця да кончыкаў пальцаў.

*Рука* – орган, што забяспечвае спецыялізаваныя тонкія рухі, шкілет якога складаецца з дзвюх костак плечавога пояса, дзвюх костак перадплечча і шкілета кісці, які складаецца з костак запясця, пясці і фаланг пальцаў.

*Твае рукі, твае рукі нада мною, –*
*Нібы лебедзі над белаю зімою.*
*Як ласкава яны кружаць*
*Іса мной па леце тужаць,*
*Нібы лебедзі над белаю зімою*
(Янка Сіпакоў).

• Чым адрозніваюцца гэтыя азначэнні? Да якіх стыляў яны належаць? Якое азначэнне больш багатае вобразна? (Апошняе.) У "Слоўніку эпітэтаў беларускай мовы" Н. Гаўрош больш за 100 эпітэтаў да назоўніка *рукі*. (Гэты слоўнік спатрэбіцца на ўроку для творчай працы адзінаццацікласнікаў.)

II. Кожная група "выцягвае" з канверта картку з заданнем. Пажадана, каб было некалькі экзэмпляраў заданняў на групу. Першае і другое заданні – аднолькавыя для ўсіх груп, трэцяе – адрознае. Вучням дазваляецца карыстацца падручнікамі, каб знайсці патрэбны тэарэтычны матэрыял. У ходзе працы настаўнік падыходзіць да груп, дае парады, кансультуе.

У першым заданні вучням прапануецца скласці верш з выкарыстаннем дадзеных рыфмаў. Па жаданні можна стварыць уласныя рыфмы пры дапамозе адваротнага слоўніка беларускай мовы. Неабходна карыстацца слоўнікам эпітэтаў, фразеалагічным і іншымі, каб твор атрымаўся ўдалы, сапраўды меў эстэтычны ўплыў на слухачоў. Другое заданне – самае складанае. У падручніку ёсць навуковае азначэнне функцыянальнага стылю мовы. Задача школьнікаў – ператварыць навуковую мову ў мастацкую. У трэцім заданні трэба знайсці ўжытыя ў сказах і вершах мастацкія сродкі рэалізацыі эстэтычнай функцыі – мастацкія тропы і стылістычныя фігуры.

**Заданне для групы.**

1. Складзіце верш, па магчымасці выкарыстайце прапанаваныя словы. Не забудзьцеся ўжыць у вашым творы мастацкія тропы!

*Клёны – зялёны, зямлі – палі, таямніцай – крыніцай, цень – прамень.*



*Вольга Юр'еўна Чумічова – выкладчык кафедры замежных моў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка, магістрант гэтай навучальнай установы. Закончыла БДПУ (2003).*

2. Вам прапанавана навуковае азначэнне функцыянальнага стылю. Як зрабіць навуковае азначэнне мастацкай характарыстыкай? Рэалізуйце эстэтычную функцыю мастацкага слова!

3. Вызначце сродкі рэалізацыі эстэтычнай функцыі літаратурнай мовы.

*У бубны дахаў вецер б'е...* (М. Багдановіч).

*Жыватворчыя дажджы падаюць на нашы прасторы, дзе пачынаюць выплываць маладыя каласы, цягнуцца да сонца набухшыя пупышкі кветак* (Я. Колас).

*Месяц жоўтаю грыўняю зазвінеў над кармою* (М. Лужанін).

*Топча, катуе тваю зямлю вылюдак ашалелы* (П. Панчанка).

*А Галя плача. Ідзе па дарозе і плача* (Я. Брыль).

*Мароз круціў за вушы раніцой* (Р. Барадулін).

*Трашчыць махорка, у хаце мур сялян, слабы агеньчык кажухі абселі* (М. Лужанін).

*Мы паспешна вяртаемся знойку да Бога, не здымаючы шапак у храмах святых і з вясёлаю верай, што гэта дарога будзе ўсё-ткі даўжэй за жыццё. Хоць на міг. Даўжэй за жыццё* (А. Бадак).

***

*Белая песня ў лугах залацістых,*
*Кліч адзвінеўшых стагоддзяў зямлі,*
*Кволая-кволая, чыстая-чыстая,*
*Быццам дзяўчына, царква на Нерлі.*
*Кроў і забойствы ў агні і дыме,*
*Подласць і жорсткасць у лютым баю, –*
*Нават яны праходзілі міма,*
*Пашкадаваўшы нявіннасць тваю.*
*Усім, хто навек адыходзіў к ценям,*
*Снілася ты на райскіх лугах*
*З яснай журбою па убіенных,*
*З ценем усмешкі ў мокрых вачах.*
*...З дальніх стагоддзяў праз цёплыя губы*
*Чую прызыўны твой галасок:*
*"Братка мой мілы, братка мой любы,*
*Выйдзь да мяне на круты беражок"*
(У. Караткевіч).

III. Праводзіцца абмен інфармацыяй паміж групамі. Вучні чытаюць вершы і азначэнні, настаўнік звяртае ўвагу на ўдалыя сродкі рэалізацыі эстэтычнай функцыі мовы, пасля кожнага верша – апладысменты! Праверка апошняга задання патрабуе ўвагі, удзельнікі іншых груп робяць заўвагі, калі яны не згодны з вызначэннем мастацкіх сродкаў.

IV. Падводзяцца вынікі ўрока, магчыма, у форме рэфлексіі – самаацэнкі вучняў і настаўніка. Гэты ўрок праходзіць у цікавай творчай форме, прыносіць практычную карысць і задавальненне. Адзнака ўсім членам групы ставіцца аднолькавая.

Літаратура

**Гаўрош Н.** Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы. – Мінск, 1998.

**Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы.** – Мінск, 1999.

**Цікоцкі М.** Стылістыка беларускай мовы. – Мінск, 1995.

*У дапамогу настаўніку*

Людміла БЫЛІНСКАЯ

# ВЫМАЎЛЕННЕ [Д] – [ДЗ'], [Т] – [Ц'] І ПРАВАПІС *Д – ДЗ, Т – Ц*

IV клас

**Мэты:** сістэматызаваць веды вучняў пра парныя і няпарныя зычныя гукі; пазнаёміць з адметнай рысай беларускага вымаўлення – дзеканнем і цеканнем, правіламі адлюстравання гэтай моўнай з'явы на пісьме; навучыць адрозніваць гукі [дз'], [ц'] ад адпаведных [д'], [т'] у рускай мове, выяўляць у словах (у тым ліку запазычаных) і тлумачыць арфаграму "д – дз", "т – ц", знаходзіць арфаграфічныя памылкі і выпраўляць іх, правільна ўжываць словы з [дз'], [ц'] у моўнай плыні; удасканальваць уменне размяжоўваць парныя і няпарныя гукі па цвёрдасці і мяккасці.

**Абсталяванне:** падручнік для IV класа Л. Васюковіч, В. Несцяровіча, Я. Марозавай "Беларуская мова" (Мінск, 2002); табліцы; тэставыя заданні.

ХОД УРОКА

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Матывацыйны этап.**

Ва ўступным слове настаўнік паведамляе пра вандроўку па краіне Арфаграфіі і прапануе кожнаму на сваім караблі праз 45 хвілін прыплысці да аднаго з астравоў, намаляваных на карце



***Людміла Сцяпанаўна Былінская** – намеснік дырэктара па навукова-метадычнай працы гімназіі № 2 г. Пінска, настаўнік беларускай мовы і літаратуры. Закончыла Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна (1986).*